ЯН ЛЯЛЕВІЧ

# Вечар, 19 снежня: фотахроніка

Здымкі, якія прапаную тут чытачам «ARCHE», прабылі са мной у ізалятары на Акрэсціна дзесяць дзён. Фотаапарат ужо перад уваходам у аўтазак я паспеў перадаць адной дзяўчыне, а флэшку са здымкамі пакінуў сабе…

На 19-га снежня я паехаў з Горадні ў Менск па ўласным жаданні, а не па закліку каго-небудзь з кандыдатаў у прэзідэнты. Таксама як па ўласным жаданні выходзіў на святкаванні Дня Волі ў Горадні напрыканцы 1990-х і напачатку 2000-х гг. і таксама як па ўласным жаданні бараніў колькі год таму гістарычную спадчыну майго роднага горада або быў на плошчы Каліноўскага ў сакавіку 2006-га…

У тыя снежаньскія дні ізноў хацелася дыхнуць паветрам свабоды (хоць раз на пяць гадоў) ды проста засведчыць разам з іншымі беларусамі сваю грамадзянскую пазіцыю. І трэба сказаць, што я ні хвіліны не шкадую аб зробленым, хаця і прыйшлося пацярпець пасля, аднак адчуванне нябачанага ўздыму чалавечых эмоцыяў, які адчуваўся падчас шэсця па праспекце Скарыны, таго, безумоўна, вартае.

Здымкі, прапанаваныя ніжэй, я забяспечыў дакладнай храналогіяй і каментарамі пра тое, як мне, гісторыку па адукацыі, бачыліся і адчуваліся розныя моманты падзеяў 19 снежня. Нічога ўнікальнага на іх, здаецца, няма, але вельмі спадзяюся, што яны стануць маім сціплым укладам у акт абвінавачання сапраўдным віноўнікам трагічных падзей, якія адгукнуліся болем у сэрцы соцень тысяч беларусаў, але адначасова спарадзілі надзею, што час свабоды ўжо блізкі.

1. 18.57. Як прыхільнік ідэй хрысціянскай дэмакратыі я вырашыў далучыцца да калоны хадэкаў. Збор каля чыгуначнага вакзала.

---

**Ян Лялевіч** — гісторык, грамадзкі актывіст.

2. 19.33. Сустрэча з прадстаўнікамі спецслужбаў у раёне вуліцы Свярдлова. Мажны кадэбіст з адкрытым ротам на заднім плане назаўтра хадзіў па ІЧУ на Акрэсціна і прыкрыкваў на «абвінавачаных». На той момант на ім ужо была не чорная куртка а-ля «дай у вока паэту», а дарагая скураная куртка, джынсы і замшавыя пантофлі.

3. 19.47. Насупраць цэнтральнай кнігарні калону чакае А. Саннікаў. Таго суправаджаюць галоўным чынам прафесійныя ахоўнікі і журналісты.

4. 21.15. Нацыянальны сцяг на будынку КДБ. Не ведаю для каго большая ганьба, для сцяга або для ўстановы. Папярэджваю супрацоўнікаў гэтага ведамства, нікога з тых, хто сцяг вывешваў, я не бачыў і не сфоткаў.

5-6. Ад 21.24 да 21.46 без каментароў.

7. 22.25. Стараюся ўстрымацца ад разгорнутых каментароў, але тут хочацца сказаць больш. Калі па яўна прадуманаму сцэнару пачаўся «штурм» Дома ўрада, я падыйшоў да бакавых дзвярэй будынка. За імі стаялі пяць шэрагаў спецназаўцаў, думаю, каля сотні чалавек. Гэта адразу праясніла карціну — «штурм» Дома ўрада, гэта пастка. Што цікава, каля гэтых дзвярэй стаяў чалавек, абкручаны нацыянальным сцягам, які спрабаваў забараніць мне фоткаць.

8-12. Ад 22.31 ад 22.35. З’яўленне спецназу. Яго пачатковыя дзеянні былі неагрэсіўнымі. Нічога не абяцала пазнейшай бойні. Я б нават сказаў, што прысутнічала нейкая нерашучасць, непрадуманасць дзеянняў з іхнага боку. На той момант загаду на разгон спецназаўцы яўна не мелі. Проста фантастычным супакоем і гераічнай паставай вылучаўся прысутны на здымках Павел Севярынец. Яго нават блізка не было каля дзвярэй Дома ўраду. Увесь час ён прасіў афіцэраў спецназу не чапаць людзей.

13. 22.39. Самае цікавае. Без ніякага націску натоўпу міліцыянеры сыходзяць і падпускаюць усіх да дзвярэй, я б нават сказаў, заахвочваюць народ ізноў падысці туды. Чаму? Магчыма, патрэбна была якасная карцінка для БТ, але хутчэй за ўсе менавіта каля 22.35 і было прынятае канчаткова рашэнне пра разгон і хапун.

14. 22.50. Дом урада быў напічканы спецназам. Байцы стаялі напэўна нават у туалетах.

Нарэшце, 23.04.-23.06, Кропка невяртання. Пасля таго як нас ахапіў спецназ, выйсці стала ўжо немагчыма. На прыступках Дома ўраду нас засталося думаю чалавек 100 (чалавек 200 прарвалася праз шэрагі спецназу злева ад галоўнага ўваходу). Супраць нас стаяла 400-500 узброеных да зубоў байцоў спецназа. Фотаапарат давялося выключыць.

Шчыра кажучы, да апошняга моманту была перакананасць, што спецназ папросту рассякае натоўп, каб усе разышліся (памяталася непусканне людзей на плошчу Каліноўскага на Дзень Волі 2006).

Ілюзіі разбіла «скрыначка», якая чакала нас ля помніка правадыру пралетарыяту.



1



2



3



4



5



6



7



8


МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ

9


МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ

10


МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ

11


МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ
МИЛИЦИЯ
СПЕЦНАЗ

12



13



14